# Талент, упрыгожаны сціпласцю

***21 верасня ў мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" адкрылася юбілейная выстава творчых работ прафесара Рыгора Фёдаравіча Шауры.***

Так здарылася, што некалькі месяцаў назад я набыў дапаможнік для настаўнікаў "Малюнак у навучальным працэсе", аўтарам якога з'яўляецца прафесар, загадчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры Рыгор Фёдаравіч Шаура. Меркаваў тады даць інфармацыю пра кнігу ў нашай газеце, ды рукі ў каламуці розных іншых спраў да гэтага так і не дайшлі, быццам "прадчувалі": будзе яшчэ адна, больш значная, нагода прыгадаць імя Рыгора Фёдаравіча ў "Настаўніцкай" — не толькі ўжо як аўтара вучэбнага дапаможніка, але і як загадчыка ў адной асобе. Такой нагодаю і стала выстава творчасці мастака "Мой родны кут", прымеркаваная да яго шасцідзесяцігадовага юбілею.

Павіншаваць Рыгора Фёдаравіча з выставай і юбілеем (які быў крышачку раней) прыйшлі, здавалася, увесь выкладчыцкі састаў універсітэта ды ледзь ці не палова яго сённяшніх і колішніх студэнтаў. Галерэю, на сценах якой, нібы жывыя, дыхалі акварэлі мастака, запоўнілі людзі, і ў вельмі многіх з іх знайшліся пранікнёныя словы ў адрас галоўнага віноўніка урачыстасці. Рыгор Фёдаравіч "павінен" быў стаміцца ад віншаванняў.

Адны, напрыклад, рэктар больш гаварылі-славілі кафедру народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якую Рыгор Фёдаравіч заснаваў у 1990 годзе і ўзначальвае да сённяшняга часу. А славіць, балазе, сапраўды ёсць што: толькі за апошнія дзесяць гадоў кафедра падрыхтавала для сферы адукацыі, культуры і народнай творчасці звыш 350 спецыялістаў, якія сёння шчыруюць як на ніве творчай дзейнасці, так і ў адукацыйнай сістэме. Уражвае і той факт, што за перыяд 1992-2002 гадоў сорак выхаванцаў кафедры сталі лаўрэатамі прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, пераможцамі святаў-конкурсаў у галіне народнага мастацтва на рэспубліканскім і міжнародным узроўнях, у тым ліку на Міжнародных конкурсах высокай моды нацыянальнага касцюма ў Маскве і Мінску.



Другія, пераважна гэта былі калегі Рыгора Фёдаравіча, больш увагі ў выступленнях аддавалі яго поспехам у асабістай навуковай кар'еры. Як было не ўспомніць, што Р.Ф. Шаурам як даследчыкам апублікавана звыш 70 навуковых прац, з іх 8 манаграфій і дапаможнікаў: "Гаўрыла Вашчанка", "Альгерд Малішэўскі", "Пейзаж у беларускім жывапісе", "Перспектыва ў малюнку і жывапісе", "Малюнак у навучальным працэсе" і інш.

Нарэшце, трэція з



галоўную, выключна чалавечую рысу Рыгора Фёдаравіча — яго сціпласць. Сціпласць, якая, нягледзячы на столькі дасягненняў ды рэгалій, і сёння вабіць да яго калег, студэнтаў, землякоў...

Сціплым Рыгор Фёдаравіч быў і ў адказе на мае пытанне "Што для вас гэтая выстава?": "60 гадоў — гэта высокая планка... Тут міжволі асэнсоўваеш усе шляхі, якія ты прайшоў перад гэтым — колькі пасадзіў дрэў, колькі напісаў кніжак, колькі выхаваў маладых людзей і адпусціў іх, як гавораць, на свой хлеб у жыццё. Мне здаецца, што ўсё гэта ў 60 гадоў

наццаць з іх узначальваю кафедру... На выставе побач з маімі работамі прадстаўлены і работы студэнтаў гэтай кафедры. Вы і самі можаце ацаніць іх узровень — узровень сапраўднага майстэрства. Што ж да маіх работ, то гэта — настальгія. Настальгія па маёй радзіме — Лепельшчыне, дзе нарадзіўся, дзе бегаў басаногім у дзяцінстве, дзе атрымаў калісьці на ўсё астатняе жыццё натхненне..."

Прызнацца, я ўжо даўно не быў сведкам такой цёплай і сардэчнай атмасферы, якая панавала 21 верасня ў мастацкай галерэі "Універсітэт культуры". Хто яе ствараў ці